УДК 37(476)(091)“16”

# ПОСТАЦЬ К. ЛЫШЧЫНСКАГА Ў ГІСТОРЫІ АЙЧЫННАЙ АДУКАЦЫІ (1660–80-я гг.)

**Самусік Андрэй Фёдаравіч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны К. Лышчынскаму – вядому беларускаму атэісту XVII ст. Увага сканцэнтравана на атрыманай ім у маладосці адукацыі, а таксама на выкладчыцкай дзейнасці ў Лышчыцкай школе, у якой ён рэарганізаваў вучэбны працэс адпаведна сваім рацыяналістычным поглядам.*

Апошняя трэць XVII ст. стала часам заняпаду езуіцкай педагагічнай сістэмы. Якасць выкладання ў школах ордэна пашагаршалася, а змест вучэбных праграм састарэў і не адпавядаў ні патрэбам грамадства, ні навуковым адкрыццям таго часу. Агульная расчараванасць езуітамі мела вынікам ажыўленне спроб стварэння альтэрнатыўных адукацыйных сістэм [7, с. 29-30]. Прадпрымалі іх не толькі іншыя манаскія ордэны ці асветныя арганізацыі, але і адукаваныя асобы з прывіліяваных саслоўяў, якія адчувалі сабе адказнымі перад грамадствам ды сваімі падданымі. Яскравым прыкладам тут з’яўляецца постаць К. Лышчынскага. У гістарыяграфіі традыцыйна акцэнт робіцца на яго атэістычных поглядах і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

судовым працэсе, асудзіўшым мысліцеля на смерць у 1689 г. Але маецца ў гэтай гісторыі і важны адукацыйны аспект, які дагэтуль абыйдзены ўвагай даследчыкаў.

Сам К. Лышчынскі атрымаў якасную адукацыю. Ён скончыў калегіўм у Брэсце, пасля якога вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі, альбо ў Кракаўскай акадэміі. Версія наконт апошняй узнікла па той прычыне, што менавіта ў Кракаве 7 снежня 1658 г. К. Лышчынскі быў залічаны ў навіцыят і праз год знаходжання ў ім уступіў у ордэн. Пры гэтым, цалкам верагодна і яго навучанне ў Віленскай акадэміі (з канца 1640-х гг.), але яно магло працягвацца толькі да захопу горада ў 1655 г. Пасля ж службы ў арміі (магчыма ў гусаркім палку) ён і з'ехаў у Кракаў. Адбыўшага навіцыят С. Лышчынскага, адправілі ў Каліш, дзе ён спачатку ўдасканальваў свае веды ў рыторыцы (1661-1662; настаўнік – Я. Квяткевіч, які ў пачатку 1650-х гг. працаваў настаўнікам у Брэсцкім калегіўме), а потым стаў вывучаць у мясцовай філасофскай студыі пад кіраўніцтвам Я. Мараўскага логіку (1662), фізіку (1663) і метафізіку (1664). Пасля завяршэння вучобы ў 1665 г. яго накіравалі ў Брэст для ўдзелу ў аднаўленні тутэйшага калегіўма (вёў заняткі ў граматычным класе), дзе ён хутка стаў віцэ-рэктарам і адказным за гаспадарчую частку. Апошнім этапам яго знаходжання ў езуіцкім ордэне стала вучоба ў тэалагічнай студыі пры Львоўскай акадэміі, якую ён не скончыў, бо з-за жаніцьбы 21 чэрвеня 1666 г. на Я. Жаліхоўскай пакінуў ордэн [4, с. 174 ; 9, с. 7-11].

Пасля разрыву сваіх адносін з езуітамі К. Лышчынскі вярнуўся на Радзіму – неаднаразова абіраўся паслом ад Брэсцкага ваяводства на соймы (1669, 1670, 1672, 1674), а ў 1682 г. быў прызначаны на пасаду падсудка брэсцкага. Жыў ён, пры гэтым, у радавым маёнтаку Лышчыцы пад Брэстам, дзе з канца 1660-х гг. выкладаў у мясцовай парафіяльнай школе, якую наведвалі дзеці мясцовых сялян і вакольнай незаможнай шляхты. Аналіз ацалелай дакументальнай спадчыны гэтага мысліцеля сведчыць, што ён ставіў пад сумнеў усю традыцыйную арганізацыю навучання, а таму паспрабаваў рэалізаваць у ёй уласны погляд на належную пабудову свецкай адукацыі. У задуманай справе яму дапамагала выдатная эрудыраванасць, якую падкрэслівалі нават яго пратыўнікі на судзе – яны заяўлялі, што абвінавачаны абладаў: "вытанчанай едкостью слоў, сабраных з розных аўтараў… не простым ці выпадковым чынам, але… дыялектычнымі доказамі, довадамі, паслядоўнасцю і высновамі абгрунтоўваў свае сцвярджэнні, выводзячы з вялікага вялікія высновы, а з меншага меншыя…" [2, с. 142 ; 9, с. 11-13].

Прыступіўшы да выкладання, К. Лышчынскі адразу ж выключыў з вучэбнай праграмы засваенне па катэхізіюу ды Св. Пісанню хрысціянскай маралі. Аб яго асабістым стаўленні да яе можна судзіць па таму, што ён даў згоду на брак уласнай дачцы з блізкім сваяком шляхцічам Дабраніжскім, а калі біскуп луцкі Я. Вітвіцкі асудзіў гэты шлюб, заявіў, што той не павінны ўмешвацца, бо гэта справа свецкая ды грамадзянская (іерарх за падобную крамолу адлучыў К. Лышчынскага ад царквы 30 жніўня 1686 г.). Верагодна К. Лышчынскі паўплываў і на агучанае ў завяшчанні рашэнне свайго старэйшага брата Мацвея (быў цяжка паранены ў час вайны і памёр ва ўзросце 40 год) аб пахаванні без выканання адпаведных царкоўных рытуалаў, бо: "акрамя смерці няма нічога". Не дзіўна таму, і яго адмаўленне патрыстыкі з успрыманнем сентэнцый (урыўкаў) з твораў класічных аўтараў ды "айцоў царквы", як вышэйшых крыніц ведаў. У напісанай К. Лышчынскім эпітафіі на ўласнае надмагілле катэгарычна абвяшчалася, што:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“Разважлівае вучэнне мудрацоў – свядомы падман”. Рэлігію ён называў сютэмай старадаўніх памылак і састарэлых недарэчнасцей. Цікава і яго ўспрыманне ў гэтай сувязі Старога і Новага Запаветаў, якія, згодна яму, ўяўлялі сабою скажонае тэолагамі апіюанне дахрысціянскай чалавечай гісторыі [4, с. 190 ; 6, с. 33, 35-36].

У аснову ж вучэбна-выхаваўчага працэсу ў Лышчыцкай школе К. Лышчынскі заклаў рацыяналістычны падыход да пазнання Сусвету – ён сцвярджаў, што той існуе адпаведна законам прыроды, а не боскім запаветам. На судзе з гэтай нагоды, дарэчы, яго абвінавачвалі ў тым, што ён: “усё выводзіў з прыроды” у тым ліку і прычынамі ўсіх з’яў, як звычайных, так і незвычайных, лічыў яе ўздзеянне на навакольны свет, бо: “Прырода прычына самой сябе, развіваецца па прыродных законах, і ёй не патрэбна ніякая звышнатуральная сіла”. Лагічным працягам гэтага сцвярджэння было і разуменне чалавека, у якасці прыроднай істоты, а Бог толькі: “Стварэнне чалавечага розуму...”. Даводзіў К. Лышчынскі сваім вучням і ідэю аб тым, што раз чалавек, як і ўсё жывое ў прыродзе смяротны, то і яго душа таксама не бессмяротна і гіне разам з целам. У такім выпадку – не існуе ні Рая, ні Пекла, ні Чысцілішча разам з нібыта жывучымі там боскімі і д’ябльскімі ютотамі. Не будзе, па яго ўляўленнях, і Страшнага Суда з пакараннем грэшнікаў, а таму трэба пры зямным жыцці паводзіць сабе належным чынам і строга караць злачынцаў, Свецкая мараль у яго арганічна дапаўнялася грамадзянскай адказнасцю – дасягненне ўсеагульнай справядлівасці ў дзяржаве магчыма, адпаведна К. Лышчынскаму, пры ўмове, што яно будзе: “Без правіцеля, горад без начальнікаў, народ без гаспадара, храмы без святароў, капітолій без суддзяў” [3, арк. 943адв. ; 2, с. 143-145 ; 5, с. 245-248].

Выкладалюя ж ім выхаванцам найперш карысныя для жыцця прадметы: чытанне і пісьмо на польскай ды народнагутарковай мовах, асновы ліку, прыродазнаўства і г.д. З гэтай нагоды ён нават замяніў надпю над уваходам у школьны будынак – узамен скажонага сцвярджэння старажытнагрэчаскага філосафа Пратагора: “Калі сярод філосафаў уздымаецца пытанне наконт вывучэння багоў, то лепш прызнаць, што мы аб гэтым нічога не ведаем” з’явілася фраза: “Не ведаючы матэматыцы ды не войдзе” [6, с. 32 ; 10, с. 5-10]. Гэта быў яўна “камень у агарод” езуітаў, якія грэбавалі дакладнымі навукамі. Па дадзеных Т. Бліновай асобным курсам з 12 школ ордэна ў Беларусі матэматыка зрэдку ў тыя часы выкладалася толькі ў Полацку, Нясвіжы, Воршы ды Пінску [1, с. 291-297].

Не выклікае сумненняў, што азначаныя захады К. Лышчынскага ў галіне адукацыі непакоілі езуітаў не менш, чым яго тэарэтычныя атэютычныя разважанні. Сведчыць аб гэтым і адно з абвінавачванняў К. Лышчынскага: “заражаў навукай, як ядавітай атрутай, …бязвінны розум маладых і сталых людзей”. Той жа факт, што на судзе цэлы шэраг прадстаўнікоў правячай эліты (ваявода смаленскі С.К. Пясочынскі, пісар ВКЛ А.К. Гелгут, пісар земскі брэсцкі Л.К. Пацей) заступілюя за яго даказвае наяўнасць у яе асяроддзі тых, хто ставіў правы шляхціча на ўласнае светаўспрыманне і адукацыйную ініцыятыву вышэй за хрысціянскія дагматы ды аўтарытэт езуітаў у педагагічнай сферы [4, с. 178-179, 184; 8, с. 134].

## Літаратура

1. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Беларуси (Их роль в организации образования и просвещения) / Т.Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 425 с.

2. Из истории свободомыслия и атеизма в Белоруссии Минск / под ред. Е.М. Бабосова [и др.]. – Минск : Наука и техника,, 1978. – 344 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ у Мінску). – Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 22.

4. Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / сост. В.В. Дубровский [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1991. – 319 с.

5. Пракошына, К.С. Лышчынскі Казімір / К.С. Пракошына // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : Энцыкл. даведнік / гал. рэд. Б.і. Сачанка. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 245-249.

6. Прокошина, Е.С. Казимир Лыщинский / Е.С. Прокошина, В.Ф. Шалькевич. – Минск : Беларусь, 1986. – 94 с.

7. Самусік, А.Ф. Адукацыйная дзейнасць езуітаў у Беларусі ў другой палове XVII ст. / А.Ф. Самусік // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2020. – Вып. 35. – С. 28-32.

8. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і праваой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск : Маладзёжнае навуковае супольніцтва, 2002. – 247 с.

9. Nowicki, A. Kazimierz Łyszczyński : 1634-1689 / A. Nowicki. – Łódź : Wyd-wo Towarzystwa Krzewienia Kultury Świeckiej, 1989. – 80 s.

10. Seyier, J.D. Acta Lysczynskiana. Das ist : Ausführliche Nachricht von dem Leben, Schriften und Schicksaien des berüchtigten Polnischen Atheisten Casimir Lysczynski / J.D. Seyier. – Königsberg : Gedruckt M.E. Dorn, 1740. – 32 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова